**ЛІДА**

# *УЗНЁСЛА, РАМАНТЫЧНА, ПА-СЯБРОЎСКУ*

**18 сакавіка ў кніжнай краме «Книжный мир» горада Ліда адбылася цікавая падзея. Аматары мастацкага слова сабраліся тут, каб адзначыць Міжнародны дзень паэзіі і павіншаваць з выхадам дэбютнага зборніка лідскую паэтэсу Святлану Півавараву.**

Дарэчы, ідэя стварэння ў гарадской кніжнай краме літаратурнай гасцёўні належыць мужу Святланы, вядомаму паэту Руслану Піваварaву. А якое ж свята без гасцей! У імпрэзе прынялі ўдзел госці з Гродна: старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Кебіч; паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык, а таксама член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член Саюза пісьменнікаў Расіі, паэт Аляксандр Марозаў (Астравецкі раён). Прагучалі і творы лідскіх паэтаў, прадстаўнікоў Лідскага раённага літаратурнага аб'яднання «Суквецце» (кіраўнік Алесь Мацулевіч). Сярод іх – Алесь Хітрун, Ганна Рэлікоўская, Канстанцін Якубчык, Людміла Русь і іншыя. Безумоўна, галоўнай гераіняй свята творчасці стала Святлана Піваварава. Паэтэса, аўтар зборніка лірыкі «Люблю… Как много и как мало…» (Гродна, «ЮрСаПрынт», 2023) распавяла пра сваю творчую сям'ю, пра сваіх бацькоў, шчыра падзялілася з прысутнымі сваімі поглядамі на мастацтва, прадэкламавала свае паэтычныя творы. Выступленне паэтэсы суправаджалася музычным акампанементам у выкананні скрыпачкі Аліцыі Казак. Атмасферу мерапрыемства можна ахарактарызаваць як узнёсла-рамантычную і ў той жа час вельмі сяброўскую, нефармальную, пазбаўленую афіцыёзу.

Вядучы мерапрыемства, стваральнік літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», паэт Руслан Піваварaў прыклаў шмат намаганняў для таго, каб палітра літаратурнага жыцця ў горадзе Ліда набыла новыя адценні, а лідскія паэты і іх сябры атрымалі выдатную пляцоўку для сустрэч з чытачамі і выступленняў. За гэта таксама варта падзякаваць дырэктару крамы «Книжный мир» Галіне Аляксандраўне Станевіч.

Паэты і наведвальнікі мерапрыемства ў поўнай меры адчулі радасць спаткання з аднадумцамі, чыталі свае вершы, гаварылі адзін аднаму кампліменты, абменьваліся кнігамі, рабілі фота на памяць. Як высветлілася, для сапраўднага свята трэба зусім няшмат – адкласці справы і сабрацца разам каб сагрэць адзін аднаго цяплом сваіх сэрцаў. Ад імя калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ сардэчна віншуем Святлану Півавараву з выхадам яе дэбютнага

зборніка і жадаем кнізе чытацкай зацікаўленасці, запатрабаванасці, а аўтару – новых плённых этапаў на творчым шляху.

Літаратурныя гасцёўні, сустрэчы з пісьменнікамі, прэзентацыі новых выданняў у крамах – гэта звыклая практыка. Напрыклад, у сталіцы Беларусі, горадзе Мінску такія мерапрыемствы традыцыйна ладзяцца ў кнігарнях «Акадэмкніга» і «Светач». Некалькі гадоў таму яны адбываліся і ў гродзенскай кніжнай краме «Веды». Важна, што ў нас з'явіліся новыя добрыя сябры, людзі неабыякавыя да нашай агульнай справы, ініцыятары вельмі карыснага грамадска-літаратурнага праекта ў горадзе Ліда. І гэта стала выдатным падарункам да Міжнароднага дня паэзіі.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** падчас пасяджэння літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» (ініцыятар – паэт Руслан Півавараў), прысвечанага выданню дэбютнай кнігі паэтэсы Святланы Піваваравай «Люблю… Как много и как мало…» і Міжнароднаму дню паэзіі. Кніжная крама «Книжный мир», горад Ліда, 18 сакавіка 2023 года.




**На паліцах крамы «Книжный мир» (г. Ліда) – кнігі нашых калег па СПБ Ганны Скаржынскай-Савіцкай, Ліны Багданавай і Людмілы Кебіч**






Л. А. Кебіч у Лідзе



Дзмітрый Радзівончык, Людміла Кебіч (Гродна), Аляксандр Марозаў (Астравецкі раён), Святлана Піваварава (Ліда)




**Вядучы – ініцыятар літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», паэт Руслан Піваравaў**

**Уступнае слова ад старшыні ГрАА СПБ Л. А. Кебіч**









**Паэт Аляксандр Марозаў (Астравецкі раён)**

**Выступае паэтэса Святлана Піваварава (Ліда)**





**Выступае паэтэса Людміла Кебіч (Гродна)**



**Выступае госць з Гродна, паэт Дзмітрый Радзівончык**






**Кніга – у падарунак гаспадыні, дырэктару крамы «Книжный мир» Г. А. Станевіч**




**Выступае Г. А. Станевіч**





**Паэтэсы Ганна Рэлікоўская**
**і Святлана Піваварава**




Людміла Кебіч
і Алесь Хітрун












**Фота** *Руслана Піваварава і прэс-службы СПБ-Гродна*